суразмоўнік. — Уваход у вучэбныя карпусы будзе праходзіць арганізавана, каб не стваралася натоўпаў. Прымаюцца меры па забеспячэнні сацыяльнай дыстанцыі паміж абітурыентамі. Нягледзячы на тое, што для правядзення ЦТ задзейнічаны вялікія аўдыторыі і раней там размяшчалася па 150 чалавек, зараз у адным памяшканні будуць знаходзіцца не больш як 50 удзельнікаў тэсціравання. Адлегласць паміж імі будзе не менш як 1 метр. Для арганізатараў прадугледжана работа ў ахоўных масках. Абітурыентам таксама раім мець індывідуальныя сродкі засцярогі, але калі нехта забудзе, мы падрыхтуем запасныя камплекты. Безумоўна, у кожнай аўдыторыі, а таксама ў месцах агульнага карыстання будуць размешчаны сродкі дэзынфекцыі.

Вячаслаў Міхайлавіч расказаў, што ўсе інструктыўныя нарады зараз праходзяць у рэжыме анлайн.

— На сайце ўніверсітэта размешчаны памяткі і відэаінструкцыі для арганізатараў. Непасрэдна напярэдадні ЦТ плануецца відэаканферэнцыя, дзе можна будзе канчаткова высветліць усе пытанні. Ратацыя арганізатараў невысокая, многія людзі гадамі працуюць і добра ведаюць усе працэсы. Гэта дае нам падставы думаць, што цэнтралізаванае тэсціраванне пройдзе арганізавана і бяспечна для ўсіх удзельнікаў, — гаворыць Вячаслаў Малафееў.

Ён вельмі пазітыўна ацэньвае рашэнне арганізаваць ЦТ у рэзервовыя дні не толькі ў БДУ, як гэта было ў мінулыя гады, а ў кожным рэгіёне.

— Збор у адным месцы абітурыентаў з усіх куткоў краіны быў бы дадатковай эпідэмічнай нагрузкай для ўсіх удзельнікаў і арганізатараў ЦТ, — заўважыў Вячаслаў Міхайлавіч. — Па вопыце мінулых гадоў ведаем, што некаторым абітурыентам даводзілася ледзь не паўночы дабірацца ў Мінск, каб здаць іспыты. Для многіх значна прасцей даехаць да свайго абласнога цэнтра. Таму прынятае рашэнне, безумоўна, на карысць абітурыентаў.

Дарэчы, усе правілы санітарна-эпідэмічнай бяспекі будуць выконвацца і падчас правядзення ўнутраных уступных выпрабаванняў. Павялічыцца колькасць аўдыторый, зменшыцца напаўняльнасць груп, рассадка на пісьмовых экзаменах будзе ажыццяўляцца з улікам патрабаванняў сацыяльнага дыстанцыявання.

Асабісты кабінет абітурыента

Сёлета БДУ пашырыў функцыянал асабістага кабінета абітурыента, што павінна паскорыць апрацоўку дакументаў у прыёмнай камісіі.

— Калі раней асабісты кабінет абітурыента выконваў пераважна інфармацыйную функцыю, то зараз гэта сродак папярэдняй рэгістрацыі, — адзначыў Вячаслаў Малафееў. — Падобным чынам сёлета адбывалася рэгістрацыя на ЦТ, і абітурыенты ўяўляюць, як працуе сістэма. Цяпер у асабістым кабінеце, акрамя запаўнення анлайн-анкеты, заявы і загрузкі фота, можна размясціць адсканіраваныя сертыфікаты ЦТ, атэстат ці дыплом, медыцынскую даведку, дакументы, якія пацвярджаюць права на льготы. Нашы спецыялісты ацэняць правільнасць і паўнату прадстаўленага пакета дакументаў, пасля чаго абітурыент можа адразу, мінуючы грамадскую прыёмную камісію, прыйсці ў прыёмную камісію адпаведнага факультэта. Хачу падкрэсліць, што асабісты візіт абавязковы, пры гэтым трэба мець з сабой арыгіналы ўсіх дакументаў.

Такім чынам, новы функцыянал асабістага кабінета дазволіць скараціць час знаходжання абітурыента ў прыёмнай камісіі, паскорыць падачу дакументаў, і, як вынік, зменшыць колькасць людзей, якія адначасова знаходзяцца ва ўніверсітэце.

Яшчэ адной новай функцыяй асабістага кабінета стане электронная чарга. Кожнаму абітурыенту будзе рэкамендаваны аптымальны час, калі лепш прынесці дакументы. Зрэшты, канчатковае рашэнне, калі наведаць прыёмную камісію, застаецца за абітурыентам.

***

У перыяд прыёмнай кампаніі ў БДУ арганізуецца гарачая лінія, шматканальны тэлефон — 8 (017) 209 50 85. Зрабіўшы званок, абітурыенты могуць атрымаць кансультацыю па любых пытаннях паступлення ў галоўны ўніверсітэт краіны.

Галіна СІДАРОВІЧ.
sidarovich@nastgaz.by
Фота Алега ІГНАТОВІЧА.

Тэрміны ўступнай кампаніі

Сёлетняя ўступная кампанія скончыцца амаль на два тыдні пазней, чым у мінулыя гады. Напрыклад, залічэнне абітурыентаў, якія будуць паступаць ва ўстановы вышэйшай адукацыі на платнай аснове, завершыцца аж 17 жніўня. Тыя, каму пашчасціць паступіць на бюджэт, адправяцца адпачываць раней.

Прыём дакументаў

З **25 па 31 ліпеня** ўстановы вышэйшай адукацыі прымаюць дакументы ад асоб, якія паступаюць за кошт сродкаў бюджэту, а таксама на платнай аснове, калі прадугледжаны ўнутраныя ўступныя выпрабаванні.

Выпускнікі профільных педкласаў, якія паступаюць на педагагічныя спецыяльнасці па выніках субяседавання, павінны падаць дакументы **з 25 па 27 ліпеня**.

Ад абітурыентаў, якія паступаюць на платнай аснове (без здачы ўнутраных іспытаў), дакументы будуць прымацца:

✓ **з 25 ліпеня па 10 жніўня** — у Акадэміі МУС, Магілёўскім інстытуце МУС, Універсітэце грамадзянскай абароны МНС;

✓ **з 25 ліпеня па 13 жніўня** — у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў;

✓ **з 25 ліпеня па 15 жніўня** — у іншых установах вышэйшай адукацыі.

Уступныя выпрабаванні

Уступныя выпрабаванні абітурыенты будуць праходзіць:

✓ **з 1 па 3 жніўня** — ва Універсітэце грамадзянскай абароны МНС, Ваеннай акадэміі і на ваенных факультэтах;

✓ **з 1 па 7 жніўня** — у іншых установах вышэйшай адукацыі.

Залічэнне

Залічэнне абітурыентаў на спецыяльнасці, па якіх не здаюцца ўступныя выпрабаванні, на бюджэтную форму:

✓ **па 4 жніўня** — у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Ваенную акадэмію, Інстытут пагранічнай службы, Універсітэт грамадзянскай абароны МНС і на ваенныя факультэты;

✓ **па 6 жніўня** — у іншыя ўстановы вышэйшай адукацыі.

Залічэнне на бюджэтную форму на спецыяльнасці, па якіх здаюцца ўступныя выпрабаванні:

✓ **па 5 жніўня** — на ваенныя факультэты;

✓ **з 10 па 11 жніўня** — у дзяржаўныя ўстановы вышэйшай адукацыі.

Калі пасля залічэння абітурыентаў ва ўстановах вышэйшай адукацыі застануцца вакантныя бюджэтныя месцы, на іх будзе абвешчаны дадатковы набор. Ваенная акадэмія, Універсітэт грамадзянскай абароны МНС, Інстытут пагранічнай службы і ваенныя факультэты праінфармуюць абітурыентаў аб наяўнасці вакантных месцаў **да 6 жніўня**, астатнія ўстановы вышэйшай адукацыі — **да 12 жніўня** (адпаведную інфармацыю трэба будзе шукаць на сайтах канкрэтных устаноў).

Падаць дакументы на вакантныя месцы ў сілавыя ўстановы вышэйшай адукацыі і на ваенныя факультэты можна **да 7 жніўня**, у іншыя ўстановы — **да 13 жніўня**. Залічэнне на вакантныя месцы адбудзецца адпаведна **8 і 14 жніўня**.

Абітурыенты, якія паступаюць на платнай аснове, будуць залічвацца **па 17 жніўня**.

***

Для паступаючых на завочную форму ва ўстановы вышэйшай адукацыі сельскагаспадарчага профілю ўступная кампанія пройдзе ў канцы года, калі завершацца асноўныя сельгасработы. Прыём дакументаў ад іх будзе ажыццяўляцца з **15 лістапада па 5 снежня.** Уступныя іспыты пройдуць з **6 па 15 снежня**. Залічэнне на бюджэтныя і платныя месцы завершыцца **20 снежня**.

Галіна СІДАРОВІЧ.

Сачыць за ўласным паступленнем праз мабільны тэлефон — рэальна

Студэнты Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны пад кіраўніцтвам вопытных выкладчыкаў распрацавалі мабільны дадатак "Абітурыент ГДУ". Такім чынам моладзь атрымала больш зручны доступ да інтэрнэт-рэсурсаў універсітэцкага Цэнтра тэсціравання.

Дзмітрый Каваленка, Яўген Дэй і Нестар Федзін.

Раздзел "Абітурыент ГДУ" шмат гадоў з'яўляецца часткай афіцыйнага сайта ўніверсітэта. Аднак прагляд інфармацыі, асабліва табліц, з дапамогай мабільных прылад дагэтуль быў звязаны з пэўнымі цяжкасцямі, што абумоўлена рознымі фарматамі і тэхнічнымі характарыстыкамі гаджэтаў.

Па ініцыятыве рэктара ўніверсітэта Сяргея Хахомава кіраўнік Цэнтра тэсціравання Дзмітрый Хадановіч сфармуляваў перад студэнтамі і выкладчыкамі ГДУ задачу: распрацаваць мабільны дадатак для зручнага доступу абітурыентаў да даведачных матэрыялаў і асабістага кабінета. За справу ўзяліся прадстаўнікі факультэта фізікі і інфармацыйных тэхналогій.

— Вырашыць задачу мы прапанавалі студэнтам 4 курса спецыяльнасці "Камп'ютарная фізіка" Нестару Федзіну і Дзмітрыю Касцючэнку. З хлопцамі працаваў дацэнт кафедры тэарэтычнай фізікі Яўген Дэй, — расказвае дэкан факультэта фізікі і інфармацыйных тэхналогій Дзмітрый Каваленка. — Яны паспяхова рэалізавалі ўсе неабходныя элементы функцыянальнасці мабільнага дадатку, які, па сутнасці, з'яўляецца праграмнай абалонкай базавага сайта.

Самі студэнты гавораць, што для дасягнення годнай якасці дадатку яны некалькі разоў перарабляілі праект з нуля. У выніку вырашылі выкарыстоўваць натыўныя (родныя) асяроддзі распрацоўкі для платформаў Android і iOS.

— Мэтай было інтуітыўнае і простае адлюстраванне інфармацыі Цэнтра тэсціравання для абітурыентаў, з чым дадатак ужо выдатна спраўляецца. Асноўная частка работы выканана, цяпер праграма актыўна дапрацоўваецца, паляпшаецца існуючы функцыянал, — дадае Нестар Федзін.

Дзмітрый Леанідавіч падкрэслівае, што студэнты правялі вялікую, старанную работу. Пры распрацоўцы дадатку неабходна было прадугледзець захаванне даных у памяці тэлефона, прадумаць варыянты адлюстравання пры пераключэнні арыентацыі, вырашыць праблему паводзін мабільніка ў выпадку недаступнасці або адключэння сеткі, пратэсціраваць кожны элемент.

З дапамогай дадатку "Абітурыент" на экране мабільнага тэлефона можна лёгка і хутка атрымаць актуальную інфармацыю аб ходзе уступнай кампаніі, выконваць дзеянні ў кабінеце абітурыента, папярэдне падаць дакументы і адсочваць конкурсную сітуацыю, атрымліваць аператыўную інфармацыю аб цэнтралізаваным тэсціраванні.

— Трэба адзначыць, што выкарыстанне дадатку, рэгістрацыя ў асабістым кабінеце абітурыента і нават загрузка копій дакументаў не вызваляе юнакоў і дзяўчат ад неабходнасці асабістага візіту ў прыёмную камісію ўніверсітэта, — падкрэслівае кіраўнік Цэнтра тэсціравання Дзмітрый Хадановіч.

Дарэчы, літаральна на мінулым тыдні ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце завяршыўся конкурс сярод маладых вучоных на распрацоўку лепшага дадатку для мабільных тэлефонаў. Ён быў абвешчаны навукова-даследчым сектарам сумесна з прафсаюзным камітэтам студэнтаў яшчэ вясной. Удзельнічаць у конкурсе маглі ўсе жадаючыя: студэнты, магістранты, аспіранты і маладыя спецыялісты.


Дзмітрый Каваленка і Дзмітрый Хадановіч.

Асноўная задача, якая ставілася перад распрацоўшчыкамі, — стварыць цікавы, актуальны і запатрабаваны дадатак, які дазволіць палепшыць і аўтаматызаваць вучэбныя, навуковыя, выхаваўчыя або гаспадарчыя працэсы ва ўніверсітэце, а магчыма і вырашыць іншыя важныя задачы ў розных сферах жыцця. Сярод прадстаўленых на конкурс работ былі дадаткі для вызначэння геалакацыі пацыентаў і машын хуткай дапамогі, прыстасаванне для атрымання інфармацыі пра экспанаты музея ГДУ, "Расклад вучэбных заняткаў", "Бяспечны шлях" і інш.

У конкурсе прымалі ўдзел і распрацоўшчыкі дадатку "Абітурыент ГДУ" Нестар Федзін і Дзмітрый Касцючэнка. Разам са сваімі кіраўнікамі яны занялі ганаровае 2-е месца. Зараз бясплатны дадатак ужо змешчаны ў Google Play і AppStore.

Кацярына КАВАЛЕНКА.
Фота аўтара.